

Download

Вясна | Брэст
Forwarded from Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Двум хлопцам з Брэста, якіх збілі пасля затрымання, далі «хатнюю хімію» за падрыхтоўку да злачынства і нашэнне халоднай зброі

Суд Брэста разгледзеў крымінальную справу ў дачыненні да **Аляксея Куфко** і **Максіма Чыжэўскага**, якіх абвінавачвалі ў *«падрыхтоўцы да ўдзелу у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак»* (ч. 1 арт. 13 ч. 1 арт. 342 К), а Аляксея яшчэ і ў *«незаконным нашэнні халоднай зброі, здзейсненым на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж дзеянні»* (ч. 1 арт. 296 КК РБ).

Вядома, што абвінавачаных праслухоўвалі і з размоў, якія хлопцы вялі паміж сабой 9-10 жніўня, сілавікі зрабілі выснову, што яны маюць намер прымяніць фізічную сілу ў адносінах да міліцыянтаў.

Хлопцаў моцна збілі пасля затрымання — судмедэкспертыза налічыла **42 пашкоджання ў Аляксея** — аднак крымінальнай справы з гэтай нагоды распачата не было.

У выніку, суддзя **Андрэй Грушко** прысудзіў Куфко 1 год 8 месяцаў «хатняй хіміі», Чыжэўскаму — 1,5 года «хатняй хіміі».

Context

Embed

View In Channel

<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?

Copy